# СВАБОДА

№14 12 — 18 красавіка 1994 г.

Кошт 100 рублёў


# Беларускія вайскоўцы адпачывалі ў Арменіі, але не зьбівалі іранскі самалёт

Так сьцьвярджае Міністэрства абароны

**Сусьветная прэса шмат пісала пра авіякатастрофу над Нагорным Карабахам 17 сакавіка іранскага самалёта, які ляцеў з Масквы на Тэгеран зь сем'ямі іранскіх дыпляматаў. Тэгеран лічыць, што самалёт быў зьбіты сіламі супрацьпаветранай абароны Карабаху.**
**На мінулым тыдні газэта СВАБОДА атрымала зьвесткі, што да гэтай катастрофы нібыта мелі дачыненьне беларускія вайскоўцы, якія знаходзіліся ў той час у Арменіі.**

Гаворка ішла пра афіцэраў-выкладчыкаў зь Менскай вайсковай інжынэрнай вучэльні: загадчыка катэдры палкоўніка Уладзімера Валчкова, падпалкоўніка Аляксандра Белага і адстаўнога падпалкоўніка Аляксея Чорнага.

Праз Беларускае згуртаваньне вайскоўцаў СВАБОДА атрымала інфармацыю, што беларускія афіцэры езьдзілі дапамагаць армянам наладзіць ракетны комплекс С-125, якім мог быць зьбіты іранскі самалёт.

У пятніцу мы зьвязаліся з палкоўнікам Валчковым і папрасілі яго пацьвердзіць альбо абвергнуць інфармацыю. Ён заявіў, што сапраўды знаходзіўся ў Арменіі, аднак адмовіўся паведаміць якія-небудзь падрабязнасьці пра сваю паездку, спаслаўшыся на тое, што «як чалавек вайсковы» ён ня можа гаварыць з прэсай — зьвяртайцеся, маўляў, у Міністэрства абароны.

Учора раніцай мы атрымалі афіцыйнае тлумачэньне прэс-службы Міністэрства абароны. У ім гаворыцца, што «29 сакавіка афіцэры Менскай вышэйшай вайсковай вучэльні палкоўнік Уладзімер Валчкоў і падпалкоўнік Аляксандар Белы вярнуліся ў сталіцу Беларусі з Арменіі, дзе праводзілі чарговы адпачынак, а праз 10 дзён загадам міністра абароны Рэспублікі Беларусі ўжо былі звольненыя з Узброеных Сілаў. Матар'ялы расьследаваньня перадаюцца ў пракуратуру.

Што стала прычынаю няласкавага разьвітаньня з начальнікам катэдры вучэльні, кандыдатам навук, дацэнтам і старэйшым выкладчыкам, якія мелі да гэтага выдатную рэпутацыю і 77 заахвочваньняў на дваіх?

Усё проста — у пошуках лепшага жыцьця заблукалі «кузнецы» афіцэрскіх кадраў у трох соснах. Каб пакупацца ў промнях паўднёвага сонца, набыць гаючае мумiё і горны мёд, а, можа, і яшчэ нешта, вырашылі адпачывальнікі падзяліцца сваімі глыбокімі ведамі з афіцэрамі армянскай арміі. І сумяшчалі адпачынак з кансультацыямі апошніх па пытаньнях эксплюатацыі баявой тэхнікі і ўзбраеньняў.

Вось тут і разышліся права на адпачынак з абавязкамі выкананьня патрабаваньняў вайсковай прысягі, загадаў міністра абароны. Таму асабістая ініцыятыва Белага і Валчкова, якія з пагардаю паставіліся да абавязкаў, выклікала такую жорсткую рэакцыю з боку калегіі Міністэрства абароны».

Такім чынам, пасьля адміністрацыйнага расьследаваньня, якое было праведзена 5—6 красавіка на загад міністра абароны П.Казлоўскага, афіцэраў звольнілі. Матар'ялы перадаюцца ў пракуратуру. Магчыма, будзе ўзбуджана крымінальная справа.

Прэс-служба МА называе беспадстаўнымі і спробы прыпісаць Міністэрству абароны ўдзел у армяна-азэрбайджанскім канфлікце, а афіцэрам Менскай вайсковай вучэльні — зьбіцьцё іранскага самалёта.

Зразумела, што Міністэрства абароны хацела б паставіць кропку на гэтай гісторыі — маўляў, мы тут ні пры чым. Між тым СВАБОДЗЕ вядома, напрыклад, што ўвосень мінулага году ў Менскай вайсковай вучэльні прайшлі трохмесячную падрыхтоўку 30 армянскіх афіцэраў супрацьпаветранай абароны. Цяпер тут навучаюцца 20 армянскіх курсантаў па поўнай праграме...

Так што кропку, відаць, ставіць ранавата.

**Пятро ПАНКРАТОВІЧ**

# TV ПРАГРАМА


У ініцыятыўнай групе Зянона Пазьняка ўжо 2056 чалавек *стар. 2*

Адам Глёбус дае парады Аляксандру Лукашэнку *стар. 5*

Міністар абароны любіць хутка езьдзіць *стар. 8*


## Загадкавы візыт

**1—2 красавіка ў Менску знаходзілася дэлегацыя зь Югаславіі на чале зь міністрам замежных справаў гэтае краіны.**

У афіцыйнай прэсе, аднак, пра гэты візыт не было ні слова. Тым часам ёсьць зьвесткі, што югаслаўскі міністар сустракаўся ня толькі зь Пятром Краўчанкам, але таксама вёў перамовы зь Вячаславам Кебічам.

Югаславія, супраць якой уведзены міжнародныя санкцыі, шукае любую магчымасьць, каб прарваць эканамічную і палітычную блякаду. Міжнародная супольнасьць лічыць, што менавіта Югаславія (дакладней — Сэрбія) ёсьць асноўнаю віноўніцай разьвязваньня баявых дзеяньняў.

Мы пазванілі ў беларускі МЗС, каб высьветліць мэту і падрабязнасьці візыту югаслаўскага міністра. Спрабавалі даведацца пра гэта ў намесьніка міністра Станіслава Агурцова, у начальніка Ўправы двухбаковых сувязяў Віктара Гейфіка, у прэс-службе МЗС... Усё дарэмна. Нам не паведамілі ніякай інфармацыі наконт гэтага візыту. Не захацелі паведаміць. Відаць, ёсьць што хаваць.

**П.П.**


ГОД ЗАСНАВАНЬНЯ 1902
ВЫХОДЗІЦЬ З 1990

Галоўны рэдактар
**Ігар ГЕРМЯНЧУК**

Заснавальнік **Павал ЖУК**

Выдавец
**«Газэта СВАБОДА», Ltd.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
**220088, Менск,**
**вул.Іванаўская, 56**


## Пойдзем на Пазьняка!

**У чацьвер, 14 красавіка, ў менскім кінатэатры «Кастрычнік» у 18.45 адбудзецца сустрэча выбаршчыкаў зь лідарам Беларускага Народнага Фронту Зянонам Пазьняком і групай дэпутатаў Апазыцыі.**

Заля арандаваная на тры гадзіны Радай БНФ Савецкага раёну.

**М.Г.**

## Будуць дзяліць партфэлі

**Як стала вядома карэспандэнту СВАБОДЫ, 28 чэрвеня зьбярэцца чарговая сэсія Вярхоўнага Савету дзеля таго, каб вырашыць толькі адно пытаньне — абраць Канстытуцыйны суд.**

Згодна новай Канстытуцыі, суд павінен быць абраны да 1 траўня. У парляманцкіх колах сьцьвярджаюць, што на пасаду Старшыні Канстытуцыйнага суда прэтэндуюць дэпутаты Валеры Ціхіня, Дзьмітры Булахаў і, магчыма, Віктар Ганчар. Тым часам фракцыя БСДГ, як паведаміў яе лідар Алег Трусаў, будзе вылучаць на гэтую пасаду доктара юрыдычных навук прафэсара Сьцяпана Сокала.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**

## Кебіч хоча правесьці плебісцыт

**Прэм'ер-міністар Вячаслаў Кебіч не выключае, што 23 чэрвеня, у дзень выбараў першага прэзыдэнта Беларусі, грамадзянам краіны будзе прапанавана выказаць сваё стаўленьне да эканамічнай інтэграцыі з Расеяй.**

У эксклюзіўным інтэрвію «Інтэрфаксу» ў пятніцу Вячаслаў Кебіч паведаміў, што ідэя «совета с народом» упершыню была выказаная ім на паседжаньні Прэзыдыюму Ўраду 5 красавіка і падтрыманая ўсімі членамі кабінэту. Спасылаючыся на сацыялягічныя дасьледаваньні, прэм'ер заявіў, што саюз з Расеяй падтрымлівае абсалютная большасьць грамадзянаў Беларусі. Тым ня менш апытаньне насельніцтва, на ягоную думку, «няхай ускосна, але дапаможа надаць максымальную ўстойлівасьць» беларуска-расейскаму альянсу на доўгі прамежак часу, незалежна ад палітычнай сытуацыі ў краіне. «Сёньня і ў бліжэйшай пэрспэктыве сытуацыя ў Беларусі стабільная. Ейнаю асноваю зьяўляецца ўжо ратыфікаваная парлямантам дамова аб стварэньні эканамічнага саюзу з Расеяй», — лічыць Вячаслаў Кебіч.

## Ці будзе Грыб балятавацца?

**Выступ Мечыслава Грыба ў Віцебску, які надрукавалі на мінулым тыдні ўсе афіцыйныя газэты, многія назіральнікі ацанілі як праграмную прапанову будучага кандыдата ў прэзыдэнты.**

Старшыня Вярхоўнага Савету пакуль афіцыйна не заявіў, што будзе балятавацца ў прэзыдэнты. Аднак у Віцебску ён упершыню даў зразумець, што гэта ня выключана. «Пакуль што я для сябе ня вызначыў, ці буду выстаўляць сваю кандыдатуру на пасаду прэзыдэнта», — сказаў генэрал.

Між тым з колаў, блізкіх да Мечыслава Грыба, паступае інфармацыя, што цяперашні сьпікер ня супраць стаць прэзыдэнтам і мае намер усё ж уключыцца ў прэзыдэнцкую гонку. Кажуць, што па міліцэйскіх структурах ўжо нават пайшла каманда «падтрымаць Грыба». Назіральнікі лічаць, што ягоныя шанцы ня горшыя, чым у Кебіча.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**

## Камуністы яднаюцца ў Сацыялістычную партыю

**Як стала вядома «Інтэрфаксу», бліжэйшым часам у Беларусі будзе зробленая спроба аб'яднаць партыі і рухі левай арыентацыі ў адзіны перадвыбарчы блёк.**

З такою ініцыятываю плянуе выступіць новая Сацыялістычная партыя. Мяркуецца, што называцца блёк будзе «Беларусь», а ўвойдуць у яго 5 палітычных партыяў, уключаючы Партыю камуністаў Беларусі.

Па зьвестках зь інфармаваных крыніцаў, увечары 7 красавіка ў Менску адбылося паседжаньне арганізацыйнага камітэту Сацыялістычнай партыі, які вырашыў правесьці ўстаноўчы зьезд да 1 траўня і тэрмінова перадаць статут партыі ў Міністэрства юстыцыі для рэгістрацыі. Крыніцы цьвердзяць, што ў кіраўніцтва партыі ўвойдзе шэраг уплывовых асобаў зь цяперашняга кабінэту міністраў Беларусі, лідары буйных парляманцкіх фракцыяў. Паводле іхных зьвестак, «калі прэм'ер Кебіч афіцыйна заявіць пра свой намер балятавацца на пасаду прэзыдэнта, то блёк левых сілаў будзе падтрымліваць ягоную кандыдатуру».


**Падпіска на газэту СВАБОДА прымаецца ва ўсіх паштовых аддзяленьнях**
**Наш падпісны індэкс 63887**



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Камуністы патрабуюць зачыніць СВАБОДУ

**Рэспубліканскі савет «Движения за социальный прогресс и справедливость» зьвярнуўся ў пракуратуру Беларусі з заявай, у якой патрабуе разгляду законнасьці некаторых публікацыяў у газэце СВАБОДА.**

Камуністам не спадабаўся артыкул, прысьвечаны «Беларускаму згуртаваньню вайскоўцаў», праілюстраваны фотаздымкамі актывістаў БЗВ у вайсковай форме. Яны палічылі, што матэр'ял утрымлівае заклікі да насільнага зьвяржэньня існуючай улады, і ДСПС запатрабаваў зачыненьня СВАБОДЫ і ўзбуджэньня па гэтым факце крымінальнай справы.

**СІМ**

## «Арганізацыя» ўдакладняе

У №13 газэты СВАБОДА пад загалоўкам «Зноў «Маладая гвардыя»?» была зьмешчана інфармацыя, нібыта «Настаўніцкая газета» мае нейкае дачыненьне да нашай Арганізацыі.

З прычыны гэтага заяўляем, што рэдакцыя «Настаўніцкай газеты» ня мае абсалютна ніякага дачыненьня да стварэньня і дзейнасьці Арганізацыі.

**Арганізацыя**

***Ад рэдакцыі: Прыносім калегам з «Настаўніцкай газеты» прабачэньне за недакладнае паведамленьне.***

# Ініцыятыўная група Зянона Пазьняка створана

**9 красавіка ў зале менскага Палаца мастацтваў адбылося чарговае паседжаньне Сойму БНФ «Адраджэньне», аб'яднанае з устаноўчым сходам ініцыятыўнай групы збору подпісаў за вылучэньне Зянона Пазьняка кандыдатам на прэзыдэнта краіны.**

Са спавешчаньнямі ў палітычнай частцы паседжаньня выступілі Зянон Пазьняк ("Выбарчыя варыянты і пазыцыя БНФ") і Юры Хадыка ("Пра дачыненьні зь іншымі палітычнымі сіламі"). З.Пазьняк каротка спыніўся на магчымых варыянтах перамогі на выбарах Кебіча, Лукашэнкі і — дэталёва — Шушкевіча. Усе названыя кандыдатуры, на ягоную думку, непажаданыя, і выбар кожнай пагаршае становішча ў краіне.

Характарызаваў постаць С.Шушкевіча і Ю.Хадыка, і многія выступоўцы ў спрэчках. Агульная думка — магчымы прыход на пасаду прэзыдэнта гэтага чалавека быў бы выгодны намэнклятуры, бо вярнулася б сытуацыя колькімесячнай даўнасьці, калі сьпікер Шушкевіч пагаджаўся і на калектыўную бясьпеку, і на рублёвую зону. Ілюзіі наконт «дэмакрата пры ўладзе» паралізавалі б волю грамадзтва. Але паводле Канстытуцыі прэзыдэнт зьвязаны па руках і нагах Вярхоўным Саветам, і Шушкевіч ня здолее ўступіць у палітычнае змаганьне з гэтым намэнклятурным ВС і Саўмінам. Патрэбны іншы, рашучы і валявы чалавек.

Юры Хадыка канстатаваў, што раскол сярод дэмакратычных сілаў адбыўся ў сувязі з рашэньнем кіраўніцтва «Вясны-94» зрабіць стаўку на Шушкевіча. Але раскол адбываецца пры ўмовах, спрыяльных для Фронту і яго пасьлядоўнай, некан'юнктурнай палітыкі. Бальшыня нацыянальна сьведамых дэмакратычных арганізацыяў, многія сябры БСДГ, БСП і інш. падтрымліваюць кандыдатуру Фронту.

Старшыня Гарадзенскай гарадзкой рады Фронту Кастусь Жынь, старшыня Сьветлагорскай (Шацілавіцкай) рады Алесь Сіліч паведамілі пра вынікі папярэдніх апытаньняў грамадзянаў. Так, у Горадні пры даволі нізкім працэнце абыякавых і нявызначаных Пазьняк карыстаецца прыхільнасьцяй 35-40% апытаных і лідзіруе. У Шацілавіцкім раёне нявызначаных і абыякавых значна больш — за 60%. Пазьняк наперадзе і тут (18%), але даволі блізка ад яго Лукашэнка (14%).

Спачатку Сойм БНФ, а потым устаноўчы сход ініцыятыўнай групы аднагалосна (устрымаўся адзін Пазьняк) вылучылі Зянона Пазьняка на прэтэндэнта ў кандыдаты.

Старшынёй і намесьнікам старшыні ініцыятыўнай групы аднадушна выбраныя кандыдаты навук Уладзімер Анцулевіч і Вера Чуйко. Гэтыя імёны ўспрымаліся прысутнымі як зарука будучага посьпеху: менавіта пад кіраўніцтвам У.Анцулевіча і В.Чуйко два гады таму былі пасьпяхова сабраныя 442 тысячы подпісаў за рэфэрэндум аб адстаўцы ВС.

Сойм засьведчыў «Прынцыпы ўдзелу БНФ у выбарчай кампаніі», дзе адзначыў «безумоўную неабходнасьць выкананьня законаў усімі грамадзянамі Беларусі» і заявіў, што «сябры Фронту павінны пазьбягаць выкарыстаньня падчас выбараў нецывілізаваных мэтадаў палітычнай барацьбы: публічных зьняваг апанэнтаў» і пад. Пасьля першага туру выбараў у выпадку неабходнасьці Фронт правядзе палітычныя кансультацыі дзеля ўзгадненьня пазыцыяў БНФ і дэмакратычных арганізацыяў.

Рэгістраваць ініцыятыўныя групы збору подпісаў Цэнтральная выбарчая камісія пачынае 15 красавіка. Як паведаміў сакратар Управы БНФ Віктар Івашкевіч, на раніцу 11 красавіка колькасьць сяброў ініцыятыўнай групы З.Пазьняка склала 2056 чалавек. Камплектаваньне групы працягваецца. **Менскі тэлефон для кантактаў — 33-50-12.**

**І.С.**

## Каталіцкую Грамаду апраўдалі

**Кастрычніцкі раённы суд Менска прызнаў беспадстаўнымі фінансавыя прэтэнзіі Беларускай дзяржаўнай філярмоніі да лідараў Беларускай Каталіцкай Грамады і зачыніў справу.**

Пра гэты судовы працэс СВАБОДА двойчы пісала напачатку году. Сутнасьць справы ў тым, што філярмонія хацела спагнаць з Каталіцкай Грамады кампэнсацыю за сарваныя ў красавіку 1993 г. канцэрты ў менскім касьцёле на Залатой Горцы, дзе разьмяшчаецца заля камэрнай музыкі філярмоніі. Адміністрацыя філярмоніі абвінавачвала лідараў БКГ, што гэта менавіта яны арганізавалі «захоп памяшканьня» вернікамі, якія на працягу трох тыдняў круглыя суткі знаходзіліся там. У працэсе судовага разбору, аднак, высьветлілася, што БКГ тут ні пры чым, — вернікі дзейнічалі з уласнай ініцыятывы.

Цяпер у касьцёле на Залатой Горцы зьбіраюцца подпісы парафіянаў з патрабаваньнем да ўладаў цалкам перадаць сьвятыню вернікам. Сабрана ўжо больш за 15 тыс. подпісаў.

**Мікола ГРЫНЯВІЦКІ**

## Замест тэлескопаў — мікрахвалевыя печкі

**За першыя два месяцы году спад вытворчасьці ў Гарадзенскай вобласьці дасягнуў 45% у параўнаньні зь леташнім студзенем—лютым. Абласны бюджэт з-за гэтага недалічыў 8 млрд. рублёў. У вобласьці расьце нябачнае беспрацоўе, 15 тыс. чалавек па сутнасьці лішнія на заводах. Выйсьце адзінае — зрабіць для іх няпоўны працоўны дзень, каб рабочыя маглі зь нечага жыць.**

Намесьнік старшыні аблвыканкаму сп. Пашкевіч лічыць, што па сканчэньні ацяпляльнага сэзону на прадпрыемствах адбудзецца працоўны ўздым. Плата за ацяпленьне зьяўляецца сёньня вялікім эканамічным цяжарам.

Найлепш у вобласьці працавалі тры так званыя народныя прадпрыемствы. Аднак сп. Пашкевіч лічыць, што гэта тлумачыцца ня іхнай формай уласнасьці, а лепшым становішчам у адлаведных галінах прамысловасьці. Ён зазначыў, што маюць шанцы тыя, хто спрабуе пераарыентавацца і выпускаць попытныя тавары. Гэта гарадзенскія заводы «Радыёпрыбор» і гандлёвага машынабудаваньня, а таксама тры вайсковыя: гарадзенскае прадпрыемства «Волна», якое пачало выпуск трактарных генэратараў, партатыўных радыёстанцыяў і лічыльнікаў энэргіі, лідзкі завод «Нёман», дзе пачалася зборка гарадзкіх аўтобусаў, і смаргонскі оптыкамэханічны, які асвоіў выпуск мікрахвалевых печаў.

Намесьнік старшыні аблвыканкаму параўнаў стан эканомікі ў вобласьці зь інсультам: усё бачым, ведаем і разумеем, але нічога ня можам зрабіць. Аднак ён таксама зазначыў, што сытуацыя небезнадзейная. Гэтымі зьвесткамі сп. Пашкевіч падзяліўся з журналістамі на прэс-канфэрэнцыі, якая адбылася ў аблвыканкаме і прысьвячалася эканамічным пытаньням.

**Сяргей АСТРАЎЦОЎ**


**Згуртаваньне прадпрымальнікаў Беларусі, Беларускі гуманітарны адукацыйна-культурны цэнтар абвяшчаюць конкурсавы набор маладых эканамістаў і юрыстаў у недзяржаўны дасьледніцкі цэнтар «Беларускі шлях у дэмакратыю».**

**Папярэдні запіс дзеля сумоўя:**
**Тэл. 26-10-73 зь 9 да 12 гадзін;**
**Тэл. 76-86-70, 21-35-03.**







## Кебіча ніхто не арыштоўваў

**Калі мы ўбачылі гэтыя здымкі, нам падалося, быццам нашага таварыша Кебіча са скручанымі рукамі вядуць у пастарунак, а потым пасьля вызваленьня ён дае інтэрвію проста на ганку міліцыі. Мы былі занепакоіліся. Патэлефанавалі ў Саўмін. Нам адказалі, што ўсё ў парадку, што Вячаслава Францавіча ніхто не арыштоўваў. Аж ад сэрца адлягло.**



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

## Сёньня

Сяргей ДУБАВЕЦ

### Безнаяўная прыватызацыя

Мы ўсе нібыта дамовіліся, што мы ўсе — круглыя ідыёты, і — цсс! Пра гэта — ні слова. Нікому. Пачынаецца прыватызацыя. Але даруйце, якая можа быць прыватызацыя? Здаецца, і рэспубліка тая ж, і ўлада — савецкая, і кіруюць па-ранейшаму партыйныя таварышы сакратары Кебіч, Краўчанка, Таразевіч... І Ленін на пляцы стаіць. Гэта значыць, што ўсё, як і было, наша, народнае, усё для чалавека. А тут раптам — чэкі, акцыі, сэртыфікаты. Гэта ж усё наадварот! Ну няхай у Польшчы, у Літве, у Расеі — там улада зьмянілася, прыйшлі зусім іншыя людзі і кажуць: будзем будаваць капіталізм, а таму — прыватызацыя. Але ў нас жа нічога не мянялася, ніхто не прыходзіў, і капіталізму не аб'яўляў, і ад камунізму не адракаўся. І ўсё адно — прыватызацыя. Як гэта зразумець? Як цынізм, як чарговую насьмешку зь людзей, якія мірна працягваюць выконваць рашэньні партыі, гэткіх жа вышэйпамянёных таварышаў.

Ну хоць бы сказалі: народ, кру-гом! Наперадзе багна, таму ідзем назад. Дык ня кажуць! Кажуць: усё для чалавека, у тым ліку і прыватызацыя. І выходзіць: *наперазад*! А людзі зусім з панталыку збітыя, кідаюцца, ня ведаючы, дзе Бог, а дзе чорт.

Кабеціна адна на радыё тэлефануе: «Мой муж памёр мінулым летам, ці паложаны яму прыватызацыйныя чэкі?» А галоўны прыватызатар ёй адказвае: «патрэбна ад вашага мужа заяўленіе». Ну хто зь іх больш здурнеў?

Назіраючы за прыватызацыяй у Літве і Расеі, я бачу, што беларускія мудрылы вымудрылі самы заблытаны варыянт. Камуністычна-капіталістычны. Паводле Леніна-Сталыпіна. Імянныя гэтыя чэкі, якія нават не прап'еш нармальна (як у Расеі) і не назапасіш на ўласны сьвячны заводзік (як у Літве), у нас трэба мяняць на сэртыфікаты, пасьля — на акцыі заводаў, якія стаяць. Непаразуменьні, закладзеныя ў кожны канкрэтны выпадак, памнажацца на многія чэргі ў сабесах, у банках, у натарыюсаў. Пры гэтым цынізм кіраўніцтва дасягне апагею: народ атрымае дзяржаўную маёмасьць у безнаяўным выглядзе абясцэненых папераў, таму што ўся наяўная маёмасьць ужо даўно прыватызаваная (памятаеце, тады гэта называлася «прыхватызацыя»). Толькі цсс! Пра гэта — ні слова. Нікому.

Я пра ўсё гэта неяк Кебічу сказаў на вуха, але Вячаслаў Францавіч усьміхнуўся паблажліва. Маўляў, Сярога, ня строй зь сябе дурня. Мы зь цябе ўжо састроілі.

# Пятро Краўчанка псуе дачыненьні з Латвіяй і Эстоніяй

**Візыт у Беларусь на мінулым тыдні Генэральнага сакратара ААН Бутраса Галі прынёс ня толькі станоўчыя вынікі, але й пэрспэктыву пагаршэньня дачыненьняў Беларусі з Латвіяй і Эстоніяй.**

Праўда, кіраўнік ААН ні пры чым. Тут прыклаў сваю руку беларускі міністар замежных справаў Пятро Краўчанка. Даючы інтэрвію групе журналістаў пасьля сустрэчы з Бутрасам Галі 5 красавіка, той заявіў, што адным з галоўных пытаньняў перамоваў была праблема дыскрымінацыі беларусаў у Латвіі і Эстоніі. Спадар Краўчанка сказаў, што МЗС Беларусі «больш як год спакойна, карэктна ня проста вывучае гэтую сытуацыю, а вядзе перамовы з латвійскім і ў меншай ступені з эстонскім бокам». «Тым ня менш у выпадку, калі юрыдычны стан нашых братоў па крыві ня будзе паляпшацца і беларусы ў Латвіі і Эстоніі будуць зазнаваць пэўную дыскрымінацыю, мы не выключаем магчымасьці зьвяртацца ў адпаведныя міжнародныя інстытуты — такія, як Рада Эўропы, Нарада бясьпекі й супрацоўніцтва ў Эўропе, Арганізацыя Аб'яднаных Нацыяў». Пятро Краўчанка зазначыў, што пры адсутнасьці станоўчых зьменаў у гэтым пытаньні цалкам верагодна, што ў верасьні 1994 г. Беларусь выступіць ініцыятарам прыняцьця рэзалюцыі ААН аб парушэньні правоў чалавека ў Латвіі і Эстоніі.

Латвія не пакінула без увагі гэтыя выказваньні беларускага міністра. Ужо празь дзень, 7 красавіка, пасол Беларусі ў Рызе Валянцін Вялічка быў выкліканы ў Міністэрства замежных справаў Латвіі, дзе яму была ўручана афіцыйная нота латвійскага боку. Пра канкрэтны яе зьмест застаецца толькі здагадвацца, бо беларускае МЗС, якое атрымала ноту ад спадара Вялічкі 8 красавіка, нават на наступны дзень (у пятніцу 9 красавіка) захоўвала яе ў сакрэце, адмаўляючыся паказваць журналістам. Рэакцыя Эстоніі на выказваньні Пятра Краўчанкі яшчэ невядомая, аднак няма сумневу, што яна хутка зьявіцца. І тады міністэрству замежных справаў прыйдзецца прыкласьці шмат намаганьняў, каб гасіць узьніклы канфлікт.

**Ян КАМОЦКІ**



**На здымку: міністар замежных справаў Беларусі Пятро Краўчанка.**

# Швэдзкую дапамогу Ігналінскай АЭС прыпыніла Беларусь

**Дырэктар спэцпраектаў інспэкцыі ядравай энэргетыкі Швэцыі прафэсар Ян Ністад заявіў, што на швэдзкіх складах знаходзіцца тэхнічнае абсталяваньне для Ігналінскай АЭС, але справа ня рухаецца зь месца з-за пазыцыі Беларусі.**

Дапамога для ўзмацненьня бясьпекі АЭС прыпыненая, пакуль ня ўдасца дамовіцца зь Беларусяй, каб яна не выстаўляла прэтэнзіяў швэдзкім фірмам у выпадку ядравага інцыдэнту на станцыі.

«Пазыцыя Беларусі вельмі няцьвёрдая й няпэўная», — кажа Я.Ністад. Паводле яговых словаў, яшчэ ў лістападзе летась прэм'ер-міністар Швэцыі зьвярнуўся да прэм'ера Беларусі з просьбай высьветліць прычыны, чаму Беларусь не падпісвае Венскую канвэнцыю. Адказу няма.

Палажэньне канвэнцыі пра кампэнсацыі трэцяй краіне ў выпадку ядравага інцыдэнту больш за ўсё хвалюе швэдзкія фірмы, якія пастаўляюць абсталяваньне ў Ігналіну.

Не адказвае Беларусь і на прапановы падпісаць двухбаковыя пагадненьні зь Літвой і Швэцыяй. Але без такіх пагадненьняў дапамога Ігналінскай станцыі з боку заходніх краінаў немагчымая, лічыць Я.Ністад.

На сёньняшні дзень урад Швэцыі вылучыў на фінансаваньне розных праектаў, зьвязаных зь Ігналінскай АЭС, 120 мільёнаў кронаў. Швэдзкі бок ня хоча, каб склалася ўражаньне, быццам Швэцыя з-за юрыдычных праблемаў зь Беларусяй прыпыняе дапамогу Ігналінскай АЭС. «Таму на значную частку праекту дапамогі ўсё ж не паўплывае той факт, што Беларусь не падпісала Венскую канвэнцыю аб адказнасьці за ядравыя аварыі і не прыняла адпаведныя законы», — кажа Ністад.

**Андрэй КОРСАК,**
**уласны карэспандэнт**
**БелаПАН у Вільні**

ПОШТА

# Масква дапаможа нам выбраць прэзыдэнта

Я выпісваю вашую газэту ад пачатку года і падзяляю пазыцыю вашых аўтараў, якія пішуць, што ня варта нам па-рабску глядзець на Маскву і чакаць адтуль добрых навінаў. Расея была і застанецца Расеяй — аграмаднай краінай, дзе ніколі не было і ня будзе парадку.

Я не палітык і не эканаміст, але выдатна разумею, што навесьці парадак у нашым невялікім беларускім доме куды прасьцей, чым спрабаваць добра ўладкавацца ў камунальнай кватэры з назвай «Расея». Іншая рэч, што Кебіч і ягоны бяздарны ўрад ня ведаюць, як упарадкаваць наш дом. Таму яны і поўзаюць на каленях у Маскву, шукаючы паратунку — для саміх сябе, зразумела.

Я падазраю, што Кебіч ужо дамовіўся і запрадаў нас Маскве — у абмен на крэсла беларускага губарнатара. Бо зразумела, што ў нашых прэзыдэнцкіх выбарах будуць удзельнічаць ня толькі грамадзяне Беларусі, але будзе выбіраць таксама і Масква. Той, на каго яна паставіць, будзе адразу мець гарантаваныя мільёны два галасоў. А Масква, вядома, паставіць толькі на таго, хто ня будзе выпіхваць ейныя вайсковыя базы зь Беларусі, хто забясьпечыць ейнае войска адукаванымі беларускімі хлопцамі, хто ня будзе патрабаваць плату за транзыт, хто пагодзіцца пастаўляць ёй за бясцэнак харчы ды тавары... Тут Маскве ёсьць з каго выбіраць: кебічы, грыбы, лукашэнкі...

Я думаю, што гэта будзе магіла, калі грамадзяне Беларусі клюнуць на маскоўскі кручок і прагаласуюць за яе кандыдата. Вось тады мы загрузьнем у расейскай багне надоўга. Калі не назаўсёды.

**Мікалай ВАСІЛЕЎСКІ,**
**пэнсіянэр**
г.Віцебск




**6 красавіка каля расейскага пасольства ў Менску Беларуская хрысьціянска-дэмакратычная злучнасьць выставіла пікет. Сябры БХДЗ інтэлігентна параілі расейскім палітыкам і спэцслужбам паводзіць сябе ў дачыненьні да Беларусі больш абачліва.**



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Шпіёнская адысэя Эймза

*(Заканчэньне. Пачатак у №13)*

### Няўдалы выпівака

Героем найвялікшага шпіёнскага скандалу ў ЗША стаў чалавек, які ніколі нічым асаблівым не вылучаўся. Нарадзіўся Эймз у мястэчку Рывэр Фолз у штаце Ўісконсын, на працу ў ЦРУ паступіў у 1962 г., маючы 21 год, за рэкамэндацыяй свайго бацькі, які працаваў ва Ўправе аналітыкам. Да 1967 г. Эймз спалучаў працу з вучобай на гістарычным аддзяленьні Джорджтаўнскага ўнівэрсытэту, бо без унівэрсытэцкай



ступені ён ня змог бы стаць афіцэрам.

У 1969 г. ён выехаў на першае замежнае заданьне ў Турцыю. У адрозьненьне ад сваёй першай жонкі Нэнсі, якая была агрэсыўнай агенткай, Эймз нічога асаблівага ня зьдзейсьніў. Вярнуўшыся ў ЗША ў 1972 г., ён працаваў аналітыкам у штаб-кватэры ЦРУ ў Ленглі. Потым яго разам з жонкай перавялі ў Ню-Ёрк, дзе ён меўся вэрбаваць для працы на ЦРУ ААНаўскіх дыпляматаў. Нэнсі, былая жонка Эймза, якая да самага апошняга часу жыла побач з будынкам ААН на Манхатане, зьнікла са сваёй кватэры адразу ж пасьля ягонага арышту.

У дачыненьнях паміж сужэнцамі ўзьнікла крыза, калі Ольдрыч паехаў у Мэксыку і пазнаёміўся з Разарыё. Па вяртаньні ў Вашынгтон яго прызначылі ў 1983 г. на пасаду шэфа савецкага аддзелу контрвыведкі ЦРУ. Пасьля інтэнсіўнай падрыхтоўкі ён атрымаў у 1984 г. заданьне вэрбаваць савецкіх дыпляматаў у Вашынгтоне. Але здарылася наадварот: яны завэрбавалі яго. Уся справа магла скончыцца значна хутчэй, калі б ЦРУ больш уважліва сачыла за працай свайго афіцэра. Рэч у тым, што ён быў абавязаны складаць падрабязныя справаздачы пра ўсе сустрэчы з расейцамі і загадзя пра іх паведамляць. Часта ён не рабіў ні таго, ні другога.

Тымчасам на ягоным рахунку пачалі зьяўляцца першыя пяцізначныя ўклады.

Калегі адгукаюцца пра Эймза як пра нецікавага, ня надта кемлівага і схільнага да запояў нудніка. Калі намесьнік дырэктара паўночнаамэрыканскага аддзелу КДБ палкоўнік Віталі Юрчанка, які папрасіў палітычнага прытулку ў амбасадзе ЗША ў Італіі, прыляцеў з Рыму ў Вашынгтон у 1985 г., Эймз адсыпаўся пасьля вечаровай папойкі і не пасьпеў у аэрапорт. Потым ён быў адным з прызначаных дапытваць Юрчанку, які праз тры месяцы ўцёк у Маскву і заявіў, што ніколі ня здраджваў Савецкаму Саюзу і што яго выкралі амэрыканцы. У Маскву Юрчанку эскартаваў расстраляны потым Валеры Мартынаў, выдадзены Эймзам агент ФБР з амбасады СССР у Вашынгтоне.

Частка амэрыканскіх экспэртаў цяпер дапускае, што ўцёкі Юрчанкі на Захад былі ад пачатку заплянаваныя, каб адцягнуць увагу ад Эймза і стварыць зачэпку для пераводу ў Маскву Мартынава. Падчас свайго побыту ў ЗША Юрчанка выдаў двух савецкіх шпіёнаў, якім потым прыпісалі заслугі Эймза: Рональда Пэльтана (цяпер адбывае пажыцьцёвае зьняволеньне) і Эдварда Лі Ховарда (здолеў уцячы ў Маскву).

Увогуле мяркуецца, што Эймз выдаў васьмёх важных агентаў ЦРУ і двух — ФБР, якіх потым расстралялі расейцы. Падчас ягонай дзейнасьці змоўкла таксама даволі шмат драбнейшых інфарматараў ЦРУ ў Расеі. Палкоўнік Алег Гардзіеўскі, адзін з самых вядомых здраднікаў з КДБ, сёньня цьвердзіць, што гэта хутчэй за ўсё Эймз выдаў яго, калі ён кіраваў рэзыдэнтураю КДБ у расейскай амбасадзе ў Лёндане. Ён таксама мяркуе, што той мог мець дачыненьне да забойства агента ЦРУ Фрэда Вудрафа ў Грузіі летась. За тыдзень да сьмерці Вудрафа Эймз наведаў Грузію. Арышт Ольдрыча Эймза паскорылі, хоць ФБР хацела яшчэ пачакаць, каб здабыць неаспрэчны доказ ягонай здрады, напрыклад, фатаграфію зь вядомым расейскім агентам. Але Эймз якраз меўся выпраўляцца ў службовую паездку ў Маскву, і былі засьцярогі, што ён можа там застацца назаўсёды.

### Дзе другі шпіён?

Дакументы, знойдзеныя ФБР падчасператрусу ў доме Ольдрыча Эймза, сьведчаць, што Расея мае ў ЦРУ другога шпіёна. У лісьце на дзевяці старонках, атрыманым ад КДБ улетку 1989 г., Эймза папярэджвалі, што ЦРУ паставіла пастку ў сваю кампутарную сыстэму і таму ён павінен карыстацца кампутарамі Ўправы надзвычай абачліва. У час атрыманьня ліста Эймз рыхтаваўся да пераезду з Рыму ў штаб-кватэру выведкі ў ЗША.

Крыніцы ў ЦРУ пацьвярджаюць, што пасьля некалькіх незразумелых правалаў апэрацыяў у сярэдзіне 80-х гг. пад заслонай найвышэйшай таямніцы былі ўведзеныя шыфраваныя коды нутраной кампутарнай пошты ЦРУ. Калі б служба амэрыканскай электроннай выведкі перахапіла перацёк дакумантаў у КДБ, кампутарны код даў бы магчымасьць выявіць, хто ў ЦРУ меў доступ да дакуманту і перадаў яго расейцам.

Цытаваныя газэтаю Washington Post былыя высокапастаўленыя чыноўнікі ЦРУ перакананыя, што расейцы маглі атрымаць інфармацыю пра кампутарную пастку толькі ад свайго «крата» глыбока ў ЦРУ. Гэта ня мог быць Эймз.

Такія падазрэньні знаходзяць пацьверджаньне ў дакумантах, якія Эймз меў у сваім кабінэце ў ЦРУ. Адзін зь іх — рапарт пра мэтады, якімі карыстаюцца расейцы, каб зрабіць немагчымым для амэрыканскага вайсковага флёту выкрыцьцё расейскіх атамных субмарынаў. Эймз не павінен быў мець доступу да гэтага дакуманту ані ў 1993 г., калі займаўся змаганьнем з наркамафіяй, ані раней, калі кіраваў контрвыведнымі апэрацыямі ўва Ўсходняй Эўропе.

Да таго ж на адной з дыскетаў, знойдзеных у Эймза, быў сьпіс так званых камэрцыйных агентаў ЦРУ, што займаліся выведнаю дзейнасьцяй пад прыкрыцьцём бізнэсу. Яе таксама Эймз не павінен быў мець. Экспэрты цьвердзяць, што хоць Эймз мог уламіцца ў кампутарную сыстэму або выкрасьці дакуманты ў аддрукаваным выглядзе, але найбольш верагодна, што дакуманты яму перадаў другі расейскі шпіён у ЦРУ.

Дырэктар ЦРУ Джэймз Вульсі пасьля арышту Эймза парэкамэндаваў прыпыніць усе выведныя апэрацыі ў Расеі ды Ўсходняй Эўропе.

Сьледзтва высьвятляе памеры шкоды, якую нанёс ЦРУ Эймз, перадаючы інфармацыю Маскве. Яно будзе цягнуцца не адзін месяц. Але падазрэньні, што расейская выведка мае яшчэ аднаго агента, зацягнуць гэтую працэдуру на няпэўны тэрмін.

**Паводле замежнай прэсы падрыхтаваў Віктар ЛУК'ЯНАЎ**

# Парахавая бочка на Балтыцы

**Калінінградзкая вобласьць мае асаблівае значэньне для абароны Расеі і таму, паводле словаў міністра абароны Паўла Грачова, будзе карыстацца адмысловай увагай.**

У Калінінградзкай вобласьці будзе разьмяшчацца 25 тыс. жаўнераў, непасрэдна падпарадкаваных міністру абароны. Невядома, колькі расейскіх жаўнераў будуць вымушаныя ў гэтай сувязі выехаць з акругі, бо ніхто, апрача хіба што Вашынгтона і Масквы, ня ведае, колькі іх там цяпер. Лічба вагаецца ад 100 тыс. (заходнія крыніцы) да 200 тыс. (польскія крыніцы). Але дакладна вядома, што гэтыя сілы здольныя ажыцьцявіць самастойны напад на Летуву, Беларусь або Польшчу.

### Цень былой магутнасьці

Калінінградзкая вобласьць — 15000 кв.км., уціснутыя паміж Летувой і Польшчай — заўсёды мела ключавое значэньне для расейскіх генэралаў.

Горад Балтыйск быў галоўным портам вялікага Балтыйскага флёту СССР. Субмарыны менавіта гэтага флёту рэгулярна ўзьнімалі на ногі войскі берагавой аховы Швэцыі й Даніі. Заданьнем караблёў і самалётаў флёту было падтрымліваць высадку польскай дэсантнай брыгады на дацкія пляжы, калі б распачалася III сусьветная вайна.

Сёньняшні Балтыйскі флёт — гэта толькі цень былой магутнасьці. З васьмі вялікіх марскіх базаў — у Калінінградзкай вобласьці (Балтыйск), у Летуве (Клайпэда), Латвіі (Ліепая, Вэнтспілс, Рыга), у Эстоніі (Пальдыскі, Талін) і Расеі (Кранштат) — пасьля распаду СССР засталіся толькі дзьве: у Балтыйску і Кранштаце.

### Балтыйскі флёт сёньня

Балтыйскі флёт цяпер налічвае каля 150 караблёў, зь якіх 80—90 могуць браць непасрэдны ўдзел у баявых дзеяньнях. Апрача таго, флёт мае ўласную авіяцыю і да нядаўнай пары меў дывізію аховы ўзьбярэжжа. У Балтыйску дысьлякуюцца 100 караблёў, астатнія (у тым ліку ўсе субмарыны) — у Кранштаце. Камандзер флёту адмірал Ягораў цьвердзіць, што ў Калінінградзкай вобласьці няма ядравай зброі.

У Балтыйску таксама разьмяшчаецца камандаваньне 11-й гвардзейскай арміі. Тэарэтычна ў ёй павінна служыць 50 тыс. жаўнераў, але папраўдзе іх на колькі тысячаў меней. Маладыя расейцы болей ня хочуць служыць айчыне ў мундзіры.

### Загад — адпалохваць

У Калінінградзкай вобласьці асядае таксама бальшыня падразьдзелаў, выведзеных з Цэнтральнай Эўропы й Нямеччыны. Пераважна гэта баявыя аддзелы, якімі адводзілася роля наступальнай групоўкі пры нападзе на Заходнюю Эўропу. Яны забясьпечаныя найлепшай зброяй, якую толькі стварылі ў СССР і Расеі. Менавіта таму палітыкі суседніх краінаў асьцерагаюцца калінінградзкага рэгіёну.

Паводле плянаў Грачова, у вобласьці павінны застацца 25 тыс. жаўнераў, галоўным заданьнем якіх будзе «адпалохваньне». Але, здаецца, Грачоў у гэтую лічбу не ўлучыў маракоў Балтыйскага флёту, які таксама застанецца ў Балтыйску.

**Паводле замежнай прэсы падрыхтаваў Віктар ЛУК'ЯНАЎ**

### Праграма 8-га каналу з 12 па 17 красавіка

**Аўторак, 12 красавіка**
18.00 Рэкляма.
18.05 Мультсэрыял «Ганчакі». Мультфільм «Удачлівы Робін Гуд».
18.30 Муз. праграма.
19.00 «Лябірынт правасудзьдзя».
19.50 Студыя «Інтэкс» прээзнтуе: «Навіны».
20.00 Мультхітпарад.
20.40 Сямейнае кола.
20.50 «Лёс». 49 сэрыя.
21.30 Інтэрвію без пытаньняў.
21.40 «Настаўнік танцаў». Маст. фільм.
23.05 Муз. праграма.

**Серада, 13 красавіка**
18.00 Рэкляма.
18.05 Для дзяцей: «Карусэль», мультфільм «Папай-Папялушка».
18.30 Муз. праграма.
19.00 «Хіл-стрыт Блюз».
19.50 Журфак БДУ прээзнтуе...
20.00 Хатні доктар.
20.35 Тэлесэрыял «Швайцарскія рабінзоны». 12 сэрыя.
21.25 Муз. праграма «Джо Дасэн».
22.25 Справы надзённыя.
22.35 «Індывідуальны падыход». Маст. фільм з сэрыі «Махляры».

**Чацьвер, 14 красавіка**
18.00 Рэкляма.
18.05 Мультсэрыял «Сям'я Барклі». Мультфільм «Чырвоны каптурык».
18.30 Спартовая паралель.
19.20 «Лябірынт правасудзьдзя».
20.10 Мультфільмы.
20.30 «Навіны ММ4».
20.45 Сямейнае кола.
20.55 «Лёс». 50 сэрыя.
21.35 Роздумы пра джаз.
22.25 «Пакой для катаваньня» з сэрыі «Я шпіён».
23.15 Праграма відэакліпаў.

**Пятніца, 15 красавіка**
18.00 Рэкляма.
18.05 Для дзяцей: «Карусэль», фільм «Цырульнікі» з цыклу «Дзівакі».
18.30 «Солтэк» прээзнтуе: «Дорэміфасолькі».
18.35 Астра-кляса.
19.05 «Хіл-стрыт Блюз».
19.55 Журфак БДУ прээзнтуе...
20.05 Камэдыйнае шоў «Схаваная камэра».
20.30 Тэлесэрыял «Швайцарскія рабінзоны». 13 сэрыя.
21.20 Асацыяцыя дзіцячай прэсы «Зрабі сабе кар'еру».
21.30 Час мясцовы.
21.50 Справы надзённыя.
21.45 «Бой з масяжовымі ваярамі Шао Ліня». Маст. фільм.

**Субота, 16 красавіка**
15.00 Рэкляма.
15.05 Для дзяцей: «Карусэль», мультфільм.
15.30 Прапаведнік Кенэт Коплэнд.
16.00 Відэасалён запрашае. «Артыст». Маст. фільм (Індыя).
18.20 «Пераадоленьне» з цыклу «Спадарыня ўдача».
18.50 Мультфільмы.
19.00 Тэлесэрыял «Швайцарскія рабінзоны». 14 сэрыя.
19.50 Сямейнае кола.
20.00 «Лёс». 51 сэрыя.
20.40 «Постаць». МКТ.
21.00 «Солтэк» прээзнтуе: «Спартовая мазаіка».
21.30 Сем хвілінаў з «Хрыстафорам».
21.40 «Прыпынак у Токіё».
23.15 Праграма відэакліпаў.

**Нядзеля, 17 красавіка**
15.00 Рэкляма.
15.05 Дзіцячы экран. «Сябрук вясёлага чарцяняці». Маст. фільм.
16.25 «Казань айца Міхала».
16.30 Нямецкая хваля.
17.00 «Затока Небясьпечная».
17.30 Муз. праграма.
18.00 «Солтэк» прээзнтуе: «Тэлефэн», «Вуліца».
18.30 «Бізнэс-плян». ММ4.
18.50 Мультфільм.
19.00 «Швайцарскія рабінзоны». 15 сэрыя.
19.50 Асацыяцыя дзіцячай прэсы. «Зрабі сабе кар'еру».
20.00 «Лёс». 52 сэрыя.
20.45 Сустрэча з Алай Пугачовай.
21.55 «Мэрыленд». Маст. фільм.



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

